этого разграничения: и реальность, и вымысел в равной степени являются результатом нарратизации, только в одном случае искусственность мы замечаем, а в другом склонны её игнорировать” [4, с. 5].

Спосаб пабудовы мастацкіх твораў характарызуе М. Гарэцкага як сапраўды глыбокага і таленавітага пісьменніка, які па-майстэрску валодаў наратыўнымі прыёмамі. Аналіз узгаданых апавяданняў служаць пацвярджэннем гэтых слоў.

**Літаратура**


1. Гарадніцкі, Я. А. Літаратура як мастацтва: камунікатыўнасць, інтэрмедыяльнасць, наратыўнасць / Я. А. Гарадніцкі: навук.рэд. У.В. Гніламёдаў. – Мінск: Беларус. навука, 2014. – 401 с.
2. Гарэцкі, М. І. Творы: Апавяданні, аповесці / Уклад. з тэксталаг. падрыхт. Т. Голуб; Падм. М. Кенькі. – Мінск : Маст. літ., 1995. – 446 с.
3. Гарэцкі, М. І. Рускі / М. І. Гарэцкі. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://knihi.com/Maksim_Harecki/Ruski.html. – Дата доступу : 03.03.2018.
4. Ковалев, О.А. Нарративные стратегии в литературе (на материале творчества Ф.М. Достоевского) / О.А. Ковалев. – Барнаул : Изд. Алтайского гос. ун-та, 2009. – 198 с.



*Кацярына Ермаковіч*
*(Мінск)*


## ЭПІСТАЛЯРНАЯ СПАДЧЫНА СЯМ’І ГАРЭЦКІХ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ КАШТОЎНАСНА-СВЕТАПОГЛЯДНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ ВУЧНЯЎ: АКСІЯЛАГІЧНЫ ПАДЫХОД

Важным аспектам зместу сучаснага літаратурнага адукацыйнага працэсу разам з ведамі, уменнямі, навыкамі і вопытам творчай дзейнасці выступае сістэма нормаў адносін да свету, людзей, да сябе. Выпрацоўку названага кампанента ў вучняў забяспечвае паўнавартасны аналіз мастацкіх твораў, разуменне матываў паводзін герояў у пэўнай сітуацыі, вызначэнне іх светапогляду і каштоўнасных прыярытэтаў. Такая адукацыйная накіраванасць можа паспрыяць працэсу інтэрыярызацыі каштоўнасных арыентацый герояў твора ва ўласныя (асобасныя), а таксама фарміраванню каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі вучняў.

Вывучэнне беларускай літаратуры ў X – XI класах на базавым узроўні адлюстроўвае асноўныя эпохі ў развіцці мастацтва слова, актуалізуючы і сістэматызуючы папярэдне набытыя веды пра літаратурны працэс. Фарміраванне каштоўнасна-светапогляднай кампетэнцыі на дадзеным этапе літаратурнай адукацыі заключаецца ў паглыбленні ведаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ